# Змест і арганізацыя метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2025/2026 навучальным годзе

**Т. Ф. Чахлова**, метадыст вышэйшай катэгорыі ўпраўлення дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі ДУА «Акадэмія адукацыі»

Метадычная работа з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры спрыяе прафесійнаму развіццю педагогаў і павышэнню якасці адукацыйнага працэсу. Асноўныя яе задачы акрэслены ў інструктыўна-метадычным пісьме Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі ў 2025/2026 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі». Развіццё прафесійных кампетэнцый забяспечваецца праз дзейнасць метадычных фарміраванняў розных узроўняў, работа якіх павінна планавацца на падставе аналізу вынікаў папярэдняга года, узроўню і запытаў педагогаў.

На пасяджэннях метадычных аб’яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры рэкамендуецца абмеркаваць:

фарміраванне ў навучэнцаў універсальных кампетэнцый праз працу з рознымі відамі інфармацыі;

выкарыстанне кампетэнтнасна-арыентаваных і даследчых заданняў з улікам розных адукацыйных патрэб;

мадэляванне сітуацый, якія развіваюць інтэлект і эмпатыю;

фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці, праектаванне сучаснага ўрока з выкарыстаннем актыўных інавацыйных метадаў;

развіццё аналітычнай працы з тэкстам для фарміравання крытычнага і крэатыўнага мыслення;

выкарыстанне лічбавых тэхналогій, у тым ліку штучнага інтэлекту;

выхаваўчы патэнцыял мовы і літаратуры ў фарміраванні патрыятычных і маральных каштоўнасцей;

арганізацыю факультатываў і дыферэнцыраванага навучання, у тым ліку з адоранымі дзецьмі;

пераемнасць паміж пачатковай і сярэдняй адукацыяй, актывізацыю вучэбнай дзейнасці навучэнцаў.

Адукацыйны працэс у рамках кампетэнтнаснага падыходу накіраваны на фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў, іх самаадукацыі, самарэгуляцыі, крэатыўнасці і здольнасці прымяняць веды ў розных жыццёвых сітуацыях. Эфектыўнае рашэнне практычных задач

патрабуе валодання ўніверсальнымі вучэбнымі дзеяннямі – мысленнем, камунікацыяй, эмацыянальнай рэгуляцыяй, грамадзянскасцю.

Фарміраванне гэтых уменняў дапамагае вучням арыентавацца ў матэрыяле, аналізаваць інфармацыю, рабіць высновы і прымаць рашэнні. Згодна з адукацыйнымі стандартамі, прадметныя кампетэнцыі з’яўляюцца асновай універсальных: па беларускай мове – моўная, маўленчая, камунікатыўная, лінгвакультуралагічная, сацыякультурная; па літаратуры – літаратуразнаўчая, эстэтычная, вучэбна-пазнавальная, каштоўнасна-сэнсавая, культуратворчая.

На ўроках беларускай мовы і літаратуры кампетэнцыі фарміруюцца праз разнастайныя формы і метады навучання, што ставрае атмасферу супрацоўніцтва і творчасці. Асноўная форма арганізацыі навучання – урок, дзе абавязковай з’яўляецца праца з тэкстамі розных жанраў як сродкам развіцця функцыянальнай адукаванасці. Асаблівая ўвага надаецца аналітычным і камунікатыўным навыкам, групавой працы, дыялогу, параўнальнаму аналізу, стварэнню ўласных тэкстаў.

У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі выхаванне разглядаецца як «мэтанакіраваны працэс фарміравання духоўна-маральнай і эмацыянальна каштоўнаснай сферы асобы навучэнца». Выкарыстанне міжпрадметных сувязей і выхаваўчага патэнцыялу мовы і літаратуры спрыяе фарміраванню інтэлектуальнага і духоўна-маральнага свету вучняў, культуры маўлення і паважлівага стаўлення да суразмоўцы. Выхаванне, разам з навучаннем, забяспечвае цэласнае развіццё асобы. Асаблівую ролю адыгрываюць тэксты з патрыятычным зместам, якія пашыраюць краязнаўчыя веды і стымулююць аналіз жыццёвых сітуацый. Пры фармулёўцы выхаваўчых задач важна арыентавацца на дасягненне навучэнцамі асобасных вынікаў, вызначаных у стандартах і вучэбных праграмах.

**Тэхналогіі штучнага інтэлекту на вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» могуць выкарыстоўвацца ў наступных відах дзейнасці:**

дааследчая і пошукавая праца;

аналіз, рэдагаванне і карэкціроўка моўнага матэрыялу (у тым ліку створанага штучным інтэлектам);

мэтамеркаванне і пабудова індывідуальнай адукацыйнай траекторыі;

актыўнае чытанне са штучным інтэлектам у ролі навігатара (цьютара);

устанаўленне міжпрадметных сувязей;

візуалізацыя моўнага і літаратурнага матэрыялу.

Аднак штучны інтэлект не павінен і не здольны замяніць чалавека. Ён можа стаць інструментам узмацнення прафесійнай дзейнасці

настаўніка, але не заменіць педагагічную інтуіцыю і не забяспечыць асобаснага развіцця навучэнцаў.

## РЭСПУБЛІКАНСКІ ЎЗРОВЕНЬ МЕТАДЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

З мэтай забеспячэння ўмоў для развіцця прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў у дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія адукацыі» праводзяцца мерапрыемствы ў адпаведнасці з Рэспубліканскім каардынацыйным планам мерапрыемстваў дадатковай адукацыі педагагічных работнікаў (*https://akademy.by/index.php/ru/aktual/37-anons-2*), сярод якіх:

1. Семінар-практыкум «Выкарыстанне кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў на ўроках беларускай (рускай) мовы і літаратуры» для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры (29.09.2025).

2. Семінар-практыкум «Эфектыўныя метады і прыёмы падрыхтоўкі навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену па рускай мове, беларускай мове» для метадыстаў інстытутаў развіцця адукацыі, раённых (гарадскіх) вучэбна-метадычных кабінетаў, кіраўнікоў раённых вучэбна-метадычных аб’яднанняў настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры (09 – 10.10.2025).

3. Навучальныя курсы ў дыстанцыйнай форме «Педагагічны вопыт як сродак развіцця прафесійнага майстэрства настаўніка» для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (01.11.2025, 02.12.2025).

4. Навучальныя курсы (тэматычны семінар) «Сістэма працы настаўніка рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры па падрыхтоўцы навучэнцаў да прадметнай алімпіяды» для настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (17.11 – 18.11.2025).

У снежні 2025 года секцыя настаўнікаў беларускай і рускай мовы і літаратуры прыме ўдзел у XV Рэспубліканскім калядным фестывалі педагагічнага майстэрства, дзе адбудуцца майстар-класы, прысвечаныя фарміраванню функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў.

На працягу 2025/2026 навучальнага года будуць арганізаваны выязныя пасяджэнні Рэспубліканскай метадычнай школы для метадыстаў інстытутаў развіцця адукацыі, раённых (гарадскіх) вучэбна-метадычных кабінетаў, а таксама кіраўнікоў метадычных аб’яднанняў настаўнікаў беларускай і рускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Падрабязная інфармацыя пра курсавыя і міжкурсавыя мерапрыемствы, а таксама рэкамендацыі па змесце і арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і

літаратуры ў 2025/2026 навучальным годзе будзе размешчана на сайце дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі» (*https://clck.ru/3AJ8HA*).

## АБЛАСНЫ ЎЗРОВЕНЬ МЕТАДЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

На абласным узроўні ў 2025/2026 навучальным годзе рэкамендуецца прадоўжыць работу па ўдасканаленні прафесійнай кампетэнтнасці педагагічных работнікаў па пытаннях фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

Прапануецца разгледзець наступныя пытанні для ўключэння ў праграмы павышэння кваліфікацыі, навучальныя курсы, семінары і іншыя метадычныя мерапрыемствы:

павышэнне вучэбна-пошукавай актыўнасці навучэнцаў праз уключэнне ва ўрок заданняў пошукавага характару, праблемных сітуацый, вучэбных даследаванняў, праектнай дзейнасці;

фарміраванне пазнавальных і камунікатыўных уменняў праз арганізацыю навучання ў зносінах (распрацоўка і рэалізацыя разнастайных групавых, парных і іншых формаў заданняў);

праектаванне сучаснага ўрока на аснове сістэмна-дзейнаснага і кампетэнтнаснага падыходаў з выкарыстаннем актыўных і інтэрактыўных метадаў навучання (кейс-метад, дэбаты і інш.);

развіццё ўменняў навучэнцаў аналізаваць вучэбную дзейнасць, кантраляваць яе вынікі, працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі на матэрыяле прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;

арганізацыя адукацыйнага працэсу з улікам патрэб навучэнцаў з розным узроўнем навучанасці і адукацыйнымі патрэбамі;

выкарыстанне эфектыўных форм, метадаў і прыёмаў актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці на ўроках беларускай мовы і літаратуры як сродку фарміравання камунікатыўных кампетэнцый і развіцця крытычнага мыслення;

мадэляванне вучэбных і жыццёвых сітуацый, якія спрыяюць развіццю эмацыянальнага інтэлекту і выхаванню эмпатыі праз разуменне намераў і матывацыі герояў літаратуры і мастацтва;

удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры як умова павышэння якасці моўнай і літаратурнай адукацыі.

**Пры арганізацыі метадычнай работы неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на маладых педагогаў устаноў адукацыі. У рамках школы маладога настаўніка на працягу навучальнага года рэкамендуецца разгледзець наступныя пытанні:**

аналітычнае асэнсаванне нарматыўных дакументаў з улікам іх прымянення ў педагагічнай практыцы;

фарміраванне ўяўленняў пра сучасныя вучэбна-метадычныя комплексы па беларускай мове і літаратуры, удасканаленне ўмення выкарыстоўваць іх у адукацыйным працэсе;

выкарыстанне комплексу навучальных матэрыялаў па беларускай мове і літаратуры, размешчанага на платформе *https://eior.by/,* для арганізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў;

сучасныя методыкі і тэхналогіі навучання як фактар павышэння якасці адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры;

праектаванне вучэбных заняткаў з выкарыстаннем сучасных метадаў і сродкаў навучання, розных форм арганізацыі вучэбнага ўзаемадзеяння, накіраваных на дасягненне асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў.

**Прапануем у 2025/2026 навучальным годзе арганізаваць наступныя мерапрыемствы:**

**1. Выкарыстанне інавацыйных форм і метадаў інтэнсіфікацыі навучання на ўроках беларускай мовы і літаратуры як спосаб фарміравання камунікатыўных кампетэнцый і развіцця навыкаў крытычнага мыслення.**

*Форма правядзення:* семінар-практыкум.

**Абмеркаванне пытанняў:**

***Навукова-метадычны блок***

Камунікатыўна-дзейнасны падыход да фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў на ўроках беларускай мовы і літаратуры: праз узаемадзеянне – да гарманічна развітой асобы.

Інавацыйныя формы і метады інтэнсіфікацыі навучання.

***Вучэбна-метадычны блок***

***Метад праектаў*** як сродак фарміравання ўменняў адаптавацца да зменлівых умоў, арыентавацца ў розных сітуацыях, працаваць у камандзе і прымяняць атрыманыя веды на практыцы.

***Кейс-метад*** на ўроках беларускай літаратуры: самаразвіццё праз пагружэнне ў тэкст літаратурнага твора як спосаб развіцця ўмення аналізаваць сітуацыю, ацэньваць альтэрнатывы, выбіраць аптымальны варыянт і планаваць яго рэалізацыю.

***Дыскусія*** на ўроках беларускай мовы і літаратуры як сродак фарміравання камунікатыўных кампетэнцый, развіцця крытычнага мыслення і ўмення працаваць з інфармацыяй. Асобасны аспект: удзел у дыскусіях павышае самаацэнку, вучыць успрымаць крытыку, развівае ўніверсальныя вучэбныя дзеянні – планаванне, аналіз і канструктыўнае вырашэнне канфліктаў.

***Дыялогавыя трэнажоры*** на ўроках беларускай мовы як інструмент развіцця моўна-этыкетнай кампетэнцыі і эмацыянальнага інтэлекту навучэнцаў садзейнічаюць фарміраванню здольнасці да спантаннага маўлення ў межах моўнай нормы, развіццю навыкаў гнуткага выкарыстання маўленчага этыкету ў розных камунікатыўных сітуацыях і праяўленню эмпатыі.

***Практычны блок***

Мадэляванне ўрока беларускай літаратуры з элементамі вучэбнай дыскусіі (тэма на выбар).

**2. Тэксты новай прыроды (інтэрнэт-публікацыі, мультымедыятэксты, інтэрактыўная інфаграфіка) як рэсурс фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў.**

*Форма правядзення:* семінар-панарама.

**Абмеркаванне пытанняў:**

***Навукова-метадычны блок***

Новыя формы тэксту, абумоўленыя развіццём лічбавых камунікацый (гіпертэкст, нелінейныя структуры, мультымедыятэкст, інфаграфіка, элементы дапоўненай рэальнасці). Тэксты «новай прыроды» (мультымадальныя тэксты): асаблівасці ўспрымання і інтэрпрэтацыі. Віды тэкстаў новай прыроды (вербальна-візуальныя, вербальна-аўдытыўныя, вербальна-візуальна-аўдытыўныя). Дзве мадэлі канструявання тэкстаў новай прыроды: **сцісканне** (пераўтварэнне вербальнага тэксту ў мультымедыятэкст) і **зборка** (стварэнне розных знакавых структур).

***Вучэбна-метадычны блок***

Дыдактычны патэнцыял тэкстаў новай прыроды для фарміравання і развіцця функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў на ўроках і ў пазаўрочнай дзейнасці. Выкарыстанне мультытэкстаў на ўроках беларускай мовы для развіцця маўленчай культуры навучэнцаў. Мультымедыятэкст як інструмент актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў на розных этапах вучэбных заняткаў.

***Практычны блок***

Вынікі працы метадычных аб'яднанняў настаўнікаў раёна (горада) могуць быць прадстаўлены ў канцы навучальнага года (або на яго завяршальным пасяджэнні) у форме педагагічнага марафону, фестывалю, выставы метадычных распрацовак, прэзентацый, майстар-класаў, лепшых урокаў беларускай мовы і літаратуры на аснове кампетэнтнаснага падыходу.

Прадугледжваюцца розныя формы навучання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры: павышэнне кваліфікацыі ў дыстанцыйнай форме, абмен эфектыўным педагагічным вопытам, online-семінары (вебінары), канферэнцыі, метадычныя практыкумы, кансультацыі і інш.

**3. Мадэляванне вучэбных і жыццёвых сітуацый, якія спрыяюць развіццю эмацыянальнай матывацыі герояў твораў літаратуры і мастацтва.**

Форма правядзення: семінар-панарама.

Абмеркаванне пытанняў:

**Навукова-метадычны блок**

Эмацыянальны інтэлект як сістэма кампанентаў (разуменне, вербалізацыя, кантроль). Узаемасувязь высокага ўзроўню эмацыянальнага інтэлекту і вывучэння мастацкай літаратуры. Уплыў шырокага кола чытання на развіццё эмацыянальнай культуры навучэнцаў і павышэнне іх чытацкай кампетэнтнасці.

**Вучэбна-метадычны блок**

Алгарытм выбару і аналізу эпізодаў літаратурных твораў (у тым ліку ў параўнанні з іншымі відамі мастацтва) для развіцця эмацыянальнага інтэлекту. Выкарыстанне метаду праектаў на ўроках беларускай мовы («Эмацыянальны свет чалавека і выклічнікі», VII клас; «Адлюстраванне эмацыянальнага свету чалавека ў сінтаксісе», IX – XI класы) і літаратуры (стварэнне «эмацыянальнай карты» герояў; аналіз сувязі прыроды і эмацыянальнага стану персанажаў у мастацкім творы). Магчымасці нейрасетак у падборы фрагментаў літаратурных твораў і распрацоўцы заданняў для развіцця эмацыянальнага інтэлекту. Выкарыстанне літаратурных гульняў як інструменту развіцця эмацыянальнай сферы (напрыклад, інтэлектуальная гульня Ю. Б. Гіпенрэйтэр «Верш і Я»; літаратурныя і моўныя гульні Л. У. Петраноўскай і інш.).

**Практычны блок**

Стварэнне кейсаў для развіцця эмацыянальнага інтэлекту, якія ўключаюць фрагмент твора, пералік пытанняў і заданняў, а таксама крытэрыі ацэнкі. Абмеркаванне і падрыхтоўка вучнёўскіх праектаў, накіраваных на ўдасканаленне эмацыянальнай культуры. Агляд і распрацоўка аўтарскіх літаратурных і моўных гульняў, накіраваных на развіццё эмацыянальнага інтэлекту.

**4. Выкарыстанне кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў даследчага, праблемнага характару ў працэсе выкладання вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» з улікам розных адукацыйных патрэб навучэнцаў**.

Форма правядзення: семінар-практыкум.

Абмеркаванне пытанняў:

**Навукова-метадычны блок**

Асаблівасці прымянення кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў даследчага і праблемнага характару. Вучэбны праект і даследаванне як

сродак развіцця вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і выхавання навучэнцаў з рознымі адукацыйнымі патрэбамі.

**Вучэбна-метадычны блок**

Практыка-арыентаваныя сітуацыі як аснова кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў (інтэрпрэтацыя, структураванне, магчымасць, параўнанне, аналогія і інш.). Логіка канструявання заданняў даследчага і праблемнага характару. Пяцікампанентная структура кампетэнтнасна-арыентаванага задання: стымул (фарміруе матывацыю і праблемную сітуацыю); фармулёўка задання (дзеянні вучня); крыніца інфармацыі (матэрыял); бланк для выканання (структура прадстаўлення выніку); інструмент ацэньвання (крытэрыі, паказчыкі).

Вынікі прымянення заданняў: развіццё здольнасці аналізаваць нестандартныя сітуацыі, рабіць высновы, выкарыстоўваць інфармацыю для планавання і дзейнасці, прымяняць уменні ў рэальным жыцці. Асаблівасці дыферэнцыраванага падыходу пры працы з навучэнцамі з рознымі адукацыйнымі патрэбамі.

**Практычны блок**

Распрацоўка кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў даследчага і праблемнага характару для II і III ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Апрабацыя распрацаваных заданняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

**5. Удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры як умова павышэння якасці моўнай і літаратурнай адукацыі.**

Форма правядзення: тэарэтыка-практычны семінар.

Абмеркаванне пытанняў:

**Навукова-метадычны блок**

Структура прафесійнай кампетэнтнасці настаўніка: прафесійныя, асобасныя, сацыякультурныя якасці; агульнаадукацыйныя ўменні; агульнапедагагічная і псіхалагічная культура. Кампаненты прафесійнай культуры педагога і крытэрыі прафесійнай творчасці. Камунікатыўная, інфармацыйная, рэгулятыўная і інтэлектуальна-педагагічная кампетэнтнасці.

**Вучэбна-метадычны блок**

Міні-лекцыя з прэзентацыяй прафесійнай кампетэнтнасці педагога (з вопыту працы). Развіццё крэатыўнасці і прафесійнай самасвядомасці як шлях раскрыцця здольнасцей педагога. Рэфлексіўныя ўменні і асаблівасці самааналізу ўласнай дзейнасці. Гатоўнасць прэзентаваць свой педагагічны вопыт.

**Практычны блок**

Наведванне адкрытага ўрока. Спецыфіка прафесійных кампетэнцый настаўніка беларускай мовы і літаратуры. Валоданне

інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі як фактар павышэння якасці адукацыйнага працэсу, узроўню ведаў навучэнцаў і прафесіяналізму настаўніка.

## РАЁННЫ ЎЗРОВЕНЬ МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ

**Дзейнасць метадычных фарміраванняў** неабходна планаваць з улікам адукацыйнага і кваліфікацыйнага ўзроўню педагогаў, іх прафесійных інтарэсаў, запытаў, тэматыкі і вынікаў работы ў 2025/2026 навучальным годзе.

На працягу 2025/2026 навучальнага года рэкамендуецца:

правесці чатыры пасяджэнні метадычнага аб’яднання;

арганізаваць работу творчых груп, школы эфектыўнага педагагічнага вопыту і іншых метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры з мэтай павышэння якасці навучання і абмену вопытам;

стварыць умовы для адаптацыі і развіцця маладых спецыялістаў праз дзейнасць школ маладых настаўнікаў.

***Формы правядзення пасяджэнняў*** раённых метадычных аб’яднанняў: тэматычны семінар, канферэнцыя па абмене вопытам, майстар-клас, практыкум, метадычная панарама і інш. Пры неабходнасці дапускаецца выкарыстанне дыстанцыйных форм работы.

На пасяджэннях метадычных фарміраванняў (метадычнае аб’яднанне, школа маладога настаўніка, школа ўдасканалення педагагічнага майстэрства, творчыя групы і інш.) у 2025/2026 навучальным годзе рэкамендуецца разгледзець наступныя пытанні:

праектаванне сучаснага ўрока з пазіцыі сістэмна-дзейнаснага і кампетэнтнаснага падыходаў з выкарыстаннем актыўных і інтэрактыўных метадаў навучання;

выкарыстанне эфектыўных форм, метадаў і прыёмаў актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці на ўроках беларускай мовы і літаратуры; прымяненне лічбавых тэхналогій у адукацыйным працэсе, у тым ліку генератыўнага штучнага інтэлекту (нейрасетак);

развіццё навыкаў аналітычнай працы з тэкстам для фарміравання чытацкай і інфармацыйнай культуры, крытычнага і крэатыўнага мыслення, эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту як кампанентаў функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў;

роля ўрокаў беларускай мовы і літаратуры ў рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу навучэнцаў;

асаблівасці працы з адоранымі навучэнцамі;

факультатыўныя заняткі як форма дыферэнцыяцыі навучання, якая садзейнічае фарміраванню функцыянальнай адукаванасці.

## Прыкладная тэматыка і змест пасяджэнняў раённых (гарадскіх) метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры

**1. Праектаванне сучаснага ўрока з пазіцыі сістэмна-дзейнаснага і кампетэнтнаснага падыходаў з выкарыстаннем актыўных і інтэрактыўных метадаў навучання.**

***Форма правядзення:*** семінар-практыкум.

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Патрабаванні да сучаснага ўрока, месца і роля актыўных і інтэрактыўных метадаў у фарміраванні сацыяльных і вучэбных кампетэнцый, развіцці інтэлектуальных і творчых здольнасцей навучэнцаў.

**Вучэбна-метадычны блок**

Майстар-клас з прэзентацыяй праблемнай лекцыі, кейс-тэхналогій, дыдактычных гульняў, метадаў праектаў, шматмерных дыдактычных інструментаў, кластара.

**Практычны блок**

Праектаванне сучаснага ўрока з прымяненнем актыўных і інтэрактыўных метадаў; афармленне электронных прэзентацый, артыкулаў і інфармацыі ў СМІ.

**2. Развіццё навыкаў аналітычнай працы з тэкстам для фарміравання крытычнага і крэатыўнага мыслення, эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту.**

**Форма правядзення:** семінар-практыкум.

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Тэкст як прадмет вывучэння і сродак навучання; сістэма вывучэння тэмы «Тэкст» у вучэбных праграмах і вучэбных дапаможніках (падручніках) для V – XI класаў.

**Вучэбна-метадычны блок**

Праца з тэкстам для развіцця пазнавальнага і творчага патэнцыялу; прымяненне працы ў парах, міні-групах, калектыўнае рашэнне задач; выкарыстанне комплексных, лінгвастылістычных і творчых практыкаванняў; дыферэнцыраваны падыход для розных узроўняў навучэнцаў; выкарыстанне сучаснага праграмнага забеспячэння.

**Практычны блок**

Мадэляванне фрагментаў урокаў па тэме «Тэкст» з выкарыстаннем сучасных тэхналогій.

**3. Выкарыстанне лічбавых тэхналогій, у тым ліку генератыўнага штучнага інтэлекту (нейрасетак).**

**Форма правядзення:** семінар-панарама

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Месца і роля лічбавых тэхналогій у адукацыйным працэсе па беларускай мове і літаратуры. Спецыфіка выкарыстання розных лічбавых інструментаў для планавання і падрыхтоўкі дыдактычнага зместу вучэбных заняткаў, актывізацыі пазнавальнай актыўнасці і павышэння матывацыі навучэнцаў, арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці, метадычнай ацэнкі эфектыўнасці тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца.

Крытэрыі і ацэнка метадычнай мэтазгоднасці выкарыстання лічбавых тэхналогій у адукацыйным працэсе па беларускай мове і літаратуры. Дыдактычны патэнцыял лічбавых інструментаў на розных этапах вучэбных заняткаў. Змяненне адукацыйнай парадыгмы, выкліканае інтэграцыяй у адукацыйны працэс лічбавых тэхналогій, заснаваных на генератыўным штучным інтэлекце (нейрасетак): дыдактычны патэнцыял і крытэрыі адбору AI-інструментаў, эфектыўнасць, перавагі і рызыкі выкарыстання.

**Вучэбна-метадычны блок**

Лічбавыя інструменты для развіцця функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў: праца з тэкстам (аналіз, інтэрпрэтацыя, крытычнае мысленне) – LearningApps, Wordwall, MindMeister, нейрасетка ChatGPT; адказы на пытанні (разуменне, аргументацыя) – Quizlet, Kahoot!, Padlet, AnswerGarden, нейрасетка Curipod; творчыя заданні (развіццё маўлення) – Canva, StoryJumper, BookCreator. Практыка выкарыстання генератыўнага ІІ на ўроках беларускай мовы і літаратуры: персаналізацыя і адаптацыя вучэбных матэрыялаў (заданняў, тэкстаў, тэстаў, дыялогаў), генерацыя альтэрнатыўных сюжэтаў і вобразаў), візуалізацыя (літаратурныя персанажы, сцэны, дэталі, уяўленні, эмоцыі і да т. п.).

Праектная дзейнасць з інтэграцыяй лічбавых інструментаў: стварэнне мультымедыйных прадуктаў, выкарыстанне AI-аналітыкі для даследавання моўных з’яў/літаратурных тэндэнцый. Этыка і бяспека выкарыстання нейрасетак у адукацыйным працэсе па беларускай мове і літаратуры.

Фарміраванне ў навучэнцаў крытычнага стаўлення да AI-кантэнту.

**Практычны блок**

Інтэрактыўная панарама практыкі лічбавых інструментаў. Варыянт правядзення. Ратацыя па тэматычных станцыях (удзельнікі дзеляцца на групы, кожная група працуе 10-15 хвілін на станцыі, затым пераход): «Генератыўны ІІ на ўроку» (стварэнне інтэрактыўных тэматычных практыкаванняў), «Лічбавы этыкет: праверка на дэтэктары» (методыка

верыфікацыі тэкстаў, створаных дыдактычных матэрыялаў). «Адкрыты мікрафон» (дыскусія па выніках працы на станцыях, абмен практыкай выкарыстання).

**4. Роля ўрокаў беларускай мовы і літаратуры ў рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу навучэнцаў.**

**Форма правядзення:** тэматычны семінар.

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Далучэнне навучэнцаў да культурных каштоўнасцей беларускага народа, фарміраванне маральнай культуры, духоўнага свету і грамадзянскай пазіцыі.

**Вучэбна-метадычны блок**

Змест вучэбных матэрыялаў па беларускай мове і літаратуры выкарыстоўваецца як сродак фарміравання асобасных вынікаў навучэнцаў: валоданне мовай як інструментам пазнання свету і далучэння да культуры, усведамленне сябе грамадзянінам Беларусі, развіццё патрыятызму, інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай і грамадзянскай культуры. Рэалізуецца лінгвакультуралагічны аналіз тэкстаў, якія адлюстроўваюць духоўную і матэрыяльную культуру беларускага народа (традыцыі, мараль, побыт, жыццёвая філасофія, каштоўнасці, нацыянальныя сімвалы).

На ўроках выкарыстоўваюцца праблемна-сітуатыўныя заданні для аналізу сітуацый, пошуку ўласных шляхоў іх вырашэння і выхавання маральна-этычных паводзін навучэнцаў.

Міжпрадметныя сувязі беларускай мовы з літаратурай і іншымі прадметамі інтэгруюцца ў адукацыйны працэс для забеспячэння адзінства навучання і выхавання. Факультатыўныя заняткі садзейнічаюць фарміраванню сацыяльна адказных паводзін, паважлівага стаўлення да розных пунктаў гледжання і ўмення аргументавана выказваць меркаванне.

**Практычны блок**

Мадэляванне інтэграванага ўрока з выкарыстаннем твораў беларускіх пісьменнікаў і мастакоў. Вынікі работы метадычнага аб’яднання настаўнікаў раёна (горада) могуць быць прадстаўлены на завяршальным пасяджэнні або ў канцы года ў выглядзе педагагічнага марафону, фестывалю, выставы метадычных распрацовак, прэзентацый, майстар-класаў і лепшых урокаў беларускай мовы і літаратуры на аснове кампетэнтнаснага падыходу.

Прадугледжваюцца розныя формы павышэння кваліфікацыі настаўнікаў: дыстанцыйныя курсы, абмен эфектыўным педагагічным вопытам, анлайн-семінары (вебінары), канферэнцыі, метадычныя практыкумы, кансультацыі і інш.

# КРЫНІЦЫ ІНФАРМАЦЫІ

## Нарматыўныя прававыя акты і іншыя інфармацыйныя крыніцы


Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13 студзеня 2011г. са зменамі, унесенымі Законам Рэспублікі Беларусь ад 14 студзеня 2022 г. № 154-З. Па стане на 1 вер. 2022 г. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інф. Рэсп. Беларусь, 2022. – 512 с.

Канцэпцыя развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года. – URL: *https://edu.gov.by/kontseptsiya-do-2030-goda/канцэпцыя.pdf* (Дата звароту: 01.09.2025).

Аб атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі. – URL: *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22238659&p1=1&p5=0* (Дата звароту: 01.09.2025).

Інструктыўна-метадычны ліст Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі ў 2025/2026 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі». – URL: *https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2024-2025-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/instruktivno-metodicheskie-pisma.html* (Дата звароту: 18.08.2025).